*Прачытаў — перадай суседу!*

# СЕРАБРАНКА вольная

МЯСЦОВАЯ ГАЗЕТА НЕЗАЛЕЖНАГА ГРАМАДСТВА

№ 6 (10) кастрычнік 2008

Адукацыя Рэформа ці руйнаванне? **(старонка 2)**

Бацькі школьнікаў лістуюць Лукашэнку **(старонка 3)**

Дзіўныя вынікі выбараў-2008. **(старонка 4)**

БНФ — 20. Віншуем! **(старонка 5)**

## Рытуал галасавання

**Сяргей Мудрачэнка**

28 верасня серабранскі дэсант удзельнічаў у назіранні за выбарамі ў Ясенінскай акрузе № 100, дзе балатавалася сябра Сойму ПБНФ Валянціна Свяцкая.

На выбарчым пункце № 294, у сярэдняй школе на праспекце Любімава, дзе выпала назіраць мне і Арцёму Ляву, верхаводзіў дырэктар школы Уладзімір Стома, а камісія складалася з падначаленых яму настаўніц (што праўда, некаторыя праўнікі лічаць гэта парушэннем).

Адрозна ад сваіх калег з суседніх камісій таварыш Стома спрабаваў граць ролю ліберала: стрымана ўсміхаўся, ласкава даў звесткі аб колькасці атрыманых бюлетэняў, колькасці зарэгістраваных выбаршчыкаў і нават назваў прапарцыйную лічбу датэрмінова прагаласаваных – прыблізна 12-13% (дакладныя лічбы называць адмаўляўся).

Дзень галасавання старшыня пачаў жартаўлівым аповедам аб начных падзеях: "А 3-й гадзіне тэлефануе мне начальнік аддзела міліцыі, маўляў, Стома, у цябе надзвычайнае здарэнне, міліцыю ў школу не пускаюць!" Як выявілася, дырэктар наказаў вартаўніку нікога не пускаць, і той выконваў загад літаральна. Пасля ўмяшання кіраўніка ўстановы міліцыянты ўсё ж трапілі ўнутр, пэўна, каб да раніцы пільнаваць скрыню датэрміновага галасавання.

**працяг на с. 3**

## "Тут я адчуваю сябе амаль як дома"



АРТУР ЛАГОДНЫ

21 чэрвеня 2008 года Дзяржсакратар Ватыкана, кардынал **Тарчызіё Бэртонэ**, які займае другую пасля Папы Бенедыкта XVI пасаду ў іерархіі Касцёла, наведаў Серабранку

**ПАДЗЕЯ ЛЕТА! Намеснік Папы наведаў Серабранку!**

Сярод удзельнікаў урачыстасці былі заўважаны арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч, кардынал Казімір Свёнтэк, біскупы Антоній Дзям'янка і Казімір Велікаселец, іншыя святары, а таксама вольны мастак Алесь Пушкін, упаўнаважаны ў справах рэлігій і нацыянальнасцей Леанід Гуляка.

Гаспадаром на імпрэзе пачуваўся ксёндз серабранскай парафіі Ігар Лашук. Менавіта яго стараннямі ўпершыню ў найноўшай гісторыі Беларусі атрыманы дазвол на пабудову касцёла. Можна меркаваць, што дзякуючы такому паказальнаму факту Дзяржсакратар Ватыкана палічыў патрэбным прыехаць на сустрэчу з жыхарамі Серабранкі і асвяціць вуглавы камень будучага касцёла.

Ужо за гадзіну на пад'ездах да парафіі Яна Хрысціцеля, што месціцца па вуліцы Пляханава, стаялі машыны ДАІ. Міліцыянты ветліва прасілі не паркаваць машыны паблізу касцёла. Людзей вакол серабранскай парафіі станавілася ўсё болей. У асяродку прысутных панаваў святочны настрой. Перад сцэнай, змайстраванай перад будоўляй, на некалькіх шэрагах крэслаў размясціліся служкі касцёла і ганаровыя госці. На самім узвышшы размяшчаліся месцы для найвышэйшых прадстаўнікоў беларускага касцёла і высокага госця з Ватыкана.

**працяг на с. 6**

АДУКАЦЫЯ

# Рэформа альбо руйнаванне?

Учора былі пазбаўленыя льготаў пенсіянеры, сёння эканомім на сістэме адукацыі. Што заўтра? Уражаннямі ад школьнай рэформы дзеліцца настаўніца адной з сярэдніх школ.

## Што думаюць настаўнікі

Рэформы сённяшняй беларускай школе патрэбныя. Але рэформы не лакаваныя, а сутнасныя. Яны не праводзяцца спехам, а рыхтуюцца гадамі, нават дзесяцігоддзямі. Тут павінна працаваць адмысловая структура найбольш дасведчаных у дзіцячай псіхалогіі, у чалавечым станаўленні людзей. І такая структура нібыта ёсць. Гэта Акадэмія педагагічных навук Рэспублікі Беларусь. Каму ж займацца ўдасканальваннем школы, калі не гэтай установе? Але ўлада вырашыла, што трэба эканоміць бюджэтныя грошы шляхам вяртання да 11-гадовага навучання. Адпаведны дэкрэт выдадзены. Што ён прынёс школам?

Па-першае, навучальны год пачаўся, а падручнікі яшчэ не надрукавалі, ізноў перад настаўнікам паўстае праблема, па чым вучыцца. Але больш істотна, што дзеці, якія зараз перайшлі ў 11 клас, будуць здаваць у гэтым жа годзе і іспыты, а гэта значыць, што за адзін год яны мусяць прайсці школьную праграму, як за 11, так і за 12 класы. А ці пройдуць?

## Эканомія на будучыні

Акрамя праблемы з падручнікамі, праграм і прыкладнага планавання на новыя класы ніхто таксама яшчэ не распрацоўваў. Вось і зноў настаўнік, як той чараўнік, павінен нешта выгадваць і камбінаваць. Але гэткай эканоміі падалося мала. Вырашылі эканоміць на настаўніцкіх заробках. Адмянілі профільныя класы па прадметах,



АРТУР ЛАГОДНЫ

тым самым зменшылі колькасць гадзін, што прывяло да скарачэнняў працоўных месцаў.

А цяпер давайце паглядзім, як гэтая рэформа адбілася на ведах дзяцей. Я выкладаю англійскую мову, таму распавяду пра сітуацыю

> *Беларусь у новых эканамічных варунках шукае, якім чынам можна ашчаджаць бюджэтныя грошы. Дзяржапарат з усімі сілавымі структурамі прэзідэнту чапаць не хочацца, бо на ім трымаецца ягоная ўлада. Зацягваць паясы даводзіцца “менш прыярытэтным” атрымальнікам трансфертаў.*

на прыкладзе свайго прадмета, але тое самае адбываецца і па ўсіх астатніх дысцыплінах. Уявіце сабе: здольныя дзеці, якія вучылі англійскую мову з 3 класа, мусяць зараз вучыцца разам з дзецьмі , якія пачалі вывучэнне мовы з 5-га класа. Такім чынам, у 6-м класе яны апынаюцца на занятках разам. Адныя ўжо гавораць – іншыя ледзь чытаюць. Што мусіць рабіць настаўнік у такой сітуацыі? Займацца з адоранымі , а базавы ўзровень пусціць на самацёк, ці арыентавацца на слабага вучня і тым самым пазбавіць разумных дзетак магчымасці ўдасканальваць веды па прадмету? Затое былі ўведзеныя факультатывы – маўляў, хто хоча павышаць свой узровень, будзе хадзіць на факультатыў. Але адна гадзіна ў тыдзень не развязвае праблемы, а выклікае толькі новыя, чым займацца, па якой праграме ісці, як працаваць, калі на факультатыў жадаюць хадзіць як слабыя вучні, так і здольныя.

Вось так і выйдуць гэтыя дзеткі недавучкамі са школы. Летам ім прыйдзецца здаваць тэсты для паступлення ў ВНУ, а там, зразумела, ніхто дзеля іх праграму змяняць і спрашчаць не будзе. А як пасля вучыцца ва універсітэтах, калі нейкія тэмы па матэматыцы ды іншых прадметах выпадуць з іх сярэдняй адукацыі? Ва ўсім свеце, калі назапашваецца ўсё больш ведаў, адбываецца ўдасканаленне і мадэрнізацыя адукацыйных сістэм. Мы ж ідзем па шляху спрашчэння, эканомячы такім чынам на перспектывах беларусаў інтэграваецца ў сусветны рынак працы, патрабаванні якога да ўзроўню адукацыі работнікаў увесь час павышаюцца.

## Настаўнік альбо ідэолаг?

Вось так і працуе сучасны настаўнік. Ад яго ў першую чаргу патрабуюць удала аформіць дакументы і правільна весці запісы ў журналах. Што ён можа данесці дзецям, калі сённяшняя сістэма адукацыі працуе больш на кантралёра, чым на настаўніка? Бо ён ужо й не настаўнік, а ідэалагічны работнік. Упраўленне адукацыі не вельмі цікавіць, як ты навучыш матэматыцы ці біялогіі, але калі ты ўцягнеш увесь свой клас у БРСМ, то некаторыя прыемнасці табе гарантаваныя. У такіх варунках ніякая рэформа не дапаможа. Ці сем гадоў вучыць, ці сямнаццаць – вынік будзе аднолькавы. Нават сем лепш. Бо чым раней уцячэш з такой школы, тым больш у цябе шанцаў захаваць самавітасць і ўласны, нікім не скамечаны, светапогляд.

**Майка Раўбіч**

**Пытанне “Колькі вучыцца?” паўставала неаднаразова. Яшчэ ў 1964 годзе была праведзена рэформа, згодна з якой дзяцей з 10-годкі перавялі на 11-гадовае навучанне, пры гэтым настаўніцкае меркаванне нікога не цікавіла. Тое самае было зроблена і дзесяць гадоў назад, калі школьнікаў перавялі на 12-гадовае навучанне, маўляў, загружаныя нашыя дзеткі. Цяпер зноў адзінаццаць.**

АДУКАЦЫЯ


АРТУР ЛАГОДНЫ

# Бацькі вучняў СШ № 189 даслалі ліст Лукашэнку

Яны прасілі захаваць у серабранаўскай школе паглыбленае вывучэнне замежных моў. На жаль, голас простых людзей, але адказных бацькоў не быў пачуты чыноўнікамі.

Ідэя даслаць ліст ва ўсе магчымыя інстанцыі ўзнікла на бацькоўскім сходзе 6-га "Б" класа ў траўні, калі бацькам аб'явілі, што паглыбленае вывучэнне замежных моў, у адпаведнасцю са школьнай рэформай, у школе № 189 скасоўваецца.

Амаль усе прысутныя пагадзіліся падпісацца пад лістом у парламент, урад і прэзідэнту ў спадзеве, што іх голас адчаю будзе пачуты. Бацькі ў сваім лісце нагадваюць, што аддавалі сваіх дзяцей менавіта ў школу з паглыбленым вывучэннем ангельскай мовы, каб яны атрымалі сучасную адукацыю і маглі знайсці добрую працу. Сваякі навучэнцаў школы збіралі грошы на яе добраўпарадкаванне, рамонт класаў, за свае сродкі куплялі неабходныя для паглыбленага вывучэння ангельскай мовы матэрыялы. Цяпер з верасня дзеці мусяць зноў вучыць тое, што яны ўжо добра ведаюць, каб спусціцца на сярэдні для ўсёй краіны ўзровень. Іншыя прадметы яны мусяць фарсаваць, каб укласціся ў адзінацацігодку.

Праз усталяваны законам тэрмін на ліст бацькоў прыйшлі адпіскі. "Нас супакойвалі тым, што зараз ідзе абмеркаванне, рашэнне будзе прынятае Палатай прадстаўнікоў з улікам інтарэсаў грамадзянаў. Якое рашэнне ўрэшце прынята, усім вядома. Нас фактычна вадзілі за нос!", – абураецца адзін з бацькоў спадар Юрась.

Мала таго, чыноўнікі сістэмы адукацыі не пасаромеліся націснуць на тых, хто падпісаўся пад зваротам. Такіх было 12 чалавек. Бацькоў выклікалі ў школу і ўгаворвалі адмовіцца ад свайго подпісу пад зваротам, прасілі нават даць пісьмовыя тлумачэнні, што, маўляў, яны не ведалі дакладна тэкст ліста і не згодныя з ягонай катэгарычнай формай.

У школе № 189 з 20 настаўнікаў ангельскай мовы засталося чатыры. Астатніх скарацілі. Усе навукова-метадычныя напрацоўкі у вывучэнні замежнай мовы страчаны. Замест пяці гадзінаў замежнай мовы на тыдзень засталося толькі дзве.

**А.Л.**

ВЫБАРЫ-2008

# Рытуал галасавання

**пачатак на с. 1**

Маёр з мясцовага РУУС, што наглядаў за парадкам на нашым пункце ў нядзелю, жаліўся на стому (стан арганізма). Паводле слоў супрацоўніка МУС, ён з калегамі ўсе папярэднія ночы вартаваў тую скрыню, ледзь не сплючы з ёй у абдымку.

У дзень асноўнага галасавання напачатку ўсё было прыстойна. Сябры камісіі падкрэслена пільнаваліся выбарчага заканадаўства: бюлетэні нешматлікім наведнікам выдавалі толькі пасля паказу пасведчання асобы (у выключных выпадках – па пасведчанні сябра БРСМ альбо чытацкім білеце), ветліва раілі асобным неразлучным парачкам заходзіць у кабіну паасобку і г.д. (тлумачальная праца не прайшла дарма). Ачмурэлы ад нуды маёр сам распачаў са мной гаворку, у часе якой наракаў на нізкія заробкі, крытыкаваў сучасны лад і ўвогуле выявіў належную дасведчанасць што да грамадска-палітычнага жыцця ў краіне. Час ад часу ён уставаў з крэсла, каб паблукаць па навакольных памяшканнях.

Я ж мусіў быць заўжды на варце, каб старанна лічыць суайчыннікаў, якія ў гэтую нядзелю нехаць цягнуліся на выбарчы пункт. Пад канец дня стала відавочна, што выбары на маім паднаглядным абсягу не адбыліся: 28 верасня бюлетэні атрымаў толькі 31% зарэгістраваных выбаршчыкаў; з улікам "заўчасных" і "надомных" удзельнікаў галасавання (адпаведна 13 і 2%) агульная колькасць тых, хто з'явіўся на выбары, дасягнула толькі адзнакі 46%.

Раптам перад пачаткам падліку бюлетэняў да нас завіталі два міжнародныя назіральнікі ад АБСЕ у суправаджэнні апаратара агенцтва Reuters, якія пажадалі быць сведкамі ўсяго працэсу. Таварыш Стома як гасцінны гаспадар не здолеў адмовіць шаноўным гасцям.

Я ж, прыладкаваўшыся да іх, займеў рэдкую магчымасць бачыць усё зблізку, аж да зместу бюлетэняў. Падлік вёўся наступным чынам: паперкі са скрыні высыпаліся на стол, потым кожны з сябраў камісіі браў сабе жмут і раскладваў у тры стосы – за Карпенку, за Свяцкую, супраць усіх; адале ўсе падлікоўцы натавалі вынікі на нейкіх карталюшках, якія перадаваліся сакратарцы. Вышыня стосаў дазваляла меркаваць ад прыблізным размеркаванні галасоў паміж кандыдатамі. Пры гэтым у розных скрынях былі спрэс розныя вынікі: на датэрміновым галасаванні, нібыта, за Карпенку – 90%, за Свяцкую – 2%, супраць усіх – 8%; у асноўны дзень за Карпенку – 50%, за Свяцкую – 40%, супраць усіх – 10%. Нават калі ўявіць, што галасаваць заўчасна паціснулі людзі старэйшага веку, вынікі не могуць розніцца ў 20 (!) разоў.

**працяг на с. 4**

ВЫБАРЫ-2008

# Дзіўныя вынікі



**Па Свіслацкай выбарчай акрузе № 94 перамогу аддалі Генадзю Давыдзьку (фота справа). Дэпутат са стажам вылучаўся па гэтай акрузе ўпершыню і за два месяцы нібыта заваяваў сімпатыі выбаршчыкаў.**

Мабыць, нездарма дэпутат сцвярджае на сваім сайце: “Я чалавек аўралу”. Яго, паводле афіцыйных звестак, падтрымалі 55% выбаршчыкаў, нягледзячы на тое, што дэпутат галасаваў за татальную адмену льготаў.

А вось добра знаёмы жыхарам Серабранкі юрыст, руплівец на ніве абароны грамадзянскіх правоў сваіх выбаршчыкаў **Уладзімір Навасяд** нібыта атрымаў толькі 33 альбо нават 23% галасоў (глядзіце матэрыял ніжэй). Як кажуць, любоў сляпая, тым больш народная. Ці гэта не любоў зусім і не народная, а чыясьці іншая?



Па Купалаўскай жа выбарчай акрузе № 95 перамогу атрымала гісторык і палітолаг, дацэнт БДТУ Валянціна Леаненка. “Сёння шмат хто спрабуе перапісаць гісторыю. Я намагаюся данесці да сваіх студэнтаў тое, што было на самай справе. Малады чалавек мусіць разважаць над прачытаным, а не проста глытаць інфармацыю”, – кажа ў інтэрв’ю “Вячорцы” **Валянціна Леаненка** (фота злева), якая да свайго дэпутацтва выкладала амаль 28 год.

Нагадаем, дэмакратычныя кандыдаты **Валянціна Палевікова** і **Аляксандр Дабравольскі** зняліся з выбараў на знак пратэсту. Іх агітацыйныя матэрыялы адмаўляліся друкаваць.

# Уладзіміру Навасяду “адкарэктавалі” колькасць галасоў

**Паводле звестак, агучаных акруговай камісіяй, за Уладзіміра Навасяда прагаласавала 23% выбарцаў, а не 33%, як вынікае з пратаколаў участковых камісій.**

“У мяне ёсць усе падставы так сцвярджаць. Справа ў тым, што ў маёй камандзе было 60 назіральнікаў. Такая колькасць дазволіла лёгка “закрыць” назіраннем усе ўчасткі маёй акругі. Пасля падліку вывешваліся пратаколы з афіцыйнымі вынікамі галасавання на кожным участку. Прасумаваўшы вынікі, мы атрымалі 33% галасоў на маю карысць. Літаральна праз дзень акруговая камісія паменшыла афіцыйны адсотак адданых у маю падтрымку галасоў з 33% да 23%. Ім паказалася мала, што яны праз датэрміновае галасаванне забяспечылі перамогу свайму кандыдату. Так на ўчастку № 105 амаль усе 500 бюлетэняў датэрміновага галасавання былі залічаны на карысць Генадзя Давыдзькі”, – абураецца Уладзімір Навасяд.

### Самая праблемная акруга

Спадар Уладзімір упэўнены, што мае рэальную падтрымку большасці выбарцаў, і лічыць, што выбары па Свіслацкай акрузе адбываліся са шматлікімі парушэннямі. Толькі ад гэтай выбарчай акругі ў ЦВК паступіла 50 скаргаў (траціна ад усіх скаргаў па Беларусі). Калі на іх зноў прыйдуць адпіскі, Навасяд не выключае магчымасці звароту ў Вярхоўны суд.

### Ці мае права Ярмошына ?

Надзвычай паказальным кандыдат лічыць адказ Лідзіі Ярмошынай на адну з ягоных скаргаў. У лісце старшыня ЦВК піша, што ўчастковыя камісіі маюць права, але не абавязак даваць назіральнікам інфармацыю пра колькасць прагаласаваўшых датэрмінова, на даму і у дзень выбараў паводле пратаколу. No comments.

**Артур Лагодны**



Спачатку было ўсё прыгожа (Датэрміновае галасаванне ў Малінаўцы)

АРТУР ЛАГОДНЫ

# Рытуал...

працяг са с. 3

Мабыць, ахоўнікі ўсё ж не дапільнавалі “скарбонку” з датэрміновымі галасамі.

Далей было яшчэ цікавей. Замежнікі захацелі паглядзець на працэс запаўнення пратакола, чым выклікалі прыкметную збянтэжанасць кіраўніка камісіі. Паспрабаваўшы млява запярэчыць, маўляў, мы гэта зробім у кабінеце, той урэшце саступіў настойлівым іншаземцам. Сакратарка села за стол у атачэнні каляжанак і ўтаропілася ў фармуляр пратакола. Гэная службовая асоба не толькі не глядзела ў паперкі, што сабрала ў сябраў камісіі, яна нават не дакранулася да калькулятара!!! Нашая гераіня чакала непасрэднага начальніка, які са свайго кабінета прынёс і паткнуў ёй ліст, адкуль яна старанна перапісала падрыхтаваныя лічбы!

Пачуўшы мае заўвагі, частка камісіі сарамліва маўчала, а частка тэатральна абурылася. Мая прапанова пералічыць змесціва хаця б скрыні для нескарыстаных бюлетэняў, што адразу б выкрыла фальсіфікацыю, сустрэла кплівае пытанне “А хто будзе лічыць?”. Мая заява аб парушэнні Выбарчага кодэксу была разгледжаная за паўхвіліны і пакінутая без увагі. Удзельнікі спектакля пачалі хапатліва прыбіраць дэкарацыі. Іх чакалі дома мужы, сыны, дочкі, будучыню якіх яны па чужой волі вызначылі на гэтай сцэне.

ВІНШУЕМ

# БНФ 20 гадоў

*Адзінай мэты не зракуся,*
*І сэрца мне не задрыжыць.*
*Як жыць – дык жыць для Беларусі,*
*А без яе зусім не жыць*
***Ларыса Геніюш***

**18** кастрычніка — урачыстае паседжанне ў сядзібе Партыі БНФ

**19** кастрычніка — экскурсія па мясцінах франтаўскай славы

**2** лістапада — Дзяды (пачатак з ускладання кветак на магілы славутых беларусаў **а 12 гадзіне**, Усходнія могілкі Мінска)



АРТУР ЛАГОДНЫ

**Бел-чырвона-белы сцяг Партыі БНФ на агітацыйным пікеце ў Серабранцы падчас выбарчай кампаніі ў 2004–м годзе.**














ЗНАЧАКІ З КАЛЕКЦЫІ МІХАІЛА ЖУКА

СЛУХАЙ СВАБОДУ



МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

## Рэпартажы са святкавання 20-х угодкаў БНФ

**Слухайце**
612 кГц, 7115 кГц, 9750 кГц (Радыё Свабода)
6145 кГц (Радыё Рацыя)

**Глядзіце 18:00-24:00**
«SIRIUS» (пазіцыя 5˚E, палярызацыя H, 12 379,6 MHz)
«Astra 1Kr» (пазіцыя 19,2˚E, палярызацыя H, 10 773 MHz).

**Чытайце**
www.svaboda.org
www.belradio.fm
www.racyja.by
pbnf.org
nn.by
*а таксама*
**serabranka.at.tut.by**
**kamunikat.org/volnaja_sierabranka.html**

РЭХА ПАДЗЕІ





Бэртонэ вітае серабранцаў





Хор спявае “Магутны Божа” Наталлі Арсенневай

# Дзяржсакратар Ватыкана

пачатак на с.1

За сцэнай паставілі вялізны стэнд з каляровым эскізам будучага храма. Справа ад падмурка быў усталяваны экран, каб цырымонію маглі добра ўбачыць усе ахвотныя.

На сустрэчы прысутнічалі не толькі жыхары Серабранкі. Шмат моладзі прыехала з розных куткоў Беларусі. Так, прадстаўнікі дэлегацыі з Вілейкі, якая налічвала 58 чалавек, каб не згубіць адно аднаго, надзелі памаранчавыя шалікі.

“Мы прыехалі з Вілейкі, каб памаліцца і асабіста павітаць намесніка Папы на гэтай зямлі. Большасць з нас з Парафіі Узвышэння Святога Крыжа, але ёсць і проста цікаўныя жыхары Вілейшчыны. Мы, усе, хто хацеў паехаць, сабраліся разам і замовілі аўтобус,” – распавяла дзяўчына з памаранчавай стужкай.

Святую Імшу ў гэты ўрачысты для парафіі Святога Яна Хрысціцеля дзень цэлебраваў Апостальскі Адміністратар Пінскай дыяцэзіі кардынал Казімір Свёнтэк. Яму дапамагалі біскуп Пінскай дыяцэзіі Казімір Велікаселец і шматлікія святары.

Калі недзе а 19 гадзіне прыехаў



Прыгажуні з Вілейкі

Дзяржсакратар Ватыкана, кардынал Тарчызіё Бэртонэ, уступнае слова ўзяў мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч. Ён адзначыў, што многія дзесяцігоддзі на гэтай зямлі касцёлы замыкаліся, іх бурылі. Сёння прыйшоў новы час, час пабудовы касцёлаў. Асвячэнне вуглавога каменя з’яўляецца знакам гэтага адраджэння. “З такімі думкамі прашу Вас блаславіць вуглавы камень гэтага касцёла. Веру, што Вашае бласлаўленне дасць новы імпульс для далейшага будаўніцтва Касцёла, імя катораму народ божы,” – звярнуўся да Яго Эмінэнцыі арцыбіскуп.

Дзяржсакратар Ватыкана асвяціў вуглавы камень падмурка новага будынка касцёла і падпісаў адпаведныя паперы. Пасля гэтага ён асабіста перадаў знакі падзякі фундатарам будаўніцтва, паслам Італіі і Мальтыйскага ордэну, а таксама архітэктару будучага касцёла Яна Хрысціцеля спадару Яроменкў і дырэктару будаўнічай фірмы “Рытм” Вячаславу Віткоўскаму.

Пасля спявалі малітву “Ойча наш”. Двойчы над Серабранкай у гэты памятны дзень таксама лілася песня “Магутны Божа” на вершы Наталлі Арсенневай, радкі якой прабягалі на вялізным экране.

“Дзякуй Вам за Ваш візіт у нашу краіну. Ён з’яўляецца для нас вялікай духоўнай падтрымкай. Моцнага здароўя, руплівай працы, пабудовы новых касцёлаў, якія Вы зможаце асвяціць у свой наступны візіт зычаць Вам усе каталікі парафіі Яна Хрысціцеля горада Мінска”, – адзначыла наведвальніца Серабранскага касцёла, звяртаючыся да кардынала Бэртонэ.

Тарчызіё Бэртонэ перадаў у дар Ігару Лашуку камплект для адпраўлення святой імшы, каб ксёндз мог служыць не толькі ў касцёле, але і ў серабранскіх кватэрах, якія б, паводле слоў Дзяржсакратара Ватыкана, таксама маглі быць домам Госпада. Ігару Лашуку перададзены ў дарунак таксама арнат для парафіі і фотаздымак Папы Бенедыкта XVI.


Кандрусевіч і Бэртонэ дорацъ парафіі набор для набажэнстваў


Асвячэнне вуглавога каменя касцёла


а. Лашук і Бэртонэ







# наведаў Серабранку

"Малады касцёл – малады чалавек. Яго мы будуем найперш для моладзі, для тых, хто будзе ствараць нашу супольнасць, нашае заўтра. Паводле Папы Бенедыкта XVI, менавіта моладзь – надзея свету і касцёла. І Папа даў у роўным дыялогу з моладдзю надзею для яе. Сёння маладому чалавеку цяжка пераадолець спакусы, якімі яго вабіць сучасны свет. Але хіба гэта прынясе сапраўдную радасць, сапраўднае жыццё? Тое, што прапануе сучасны свет, вельмі часта, – ілюзорнае, якое вядзе да наркаманіі, алкагалізму, іншых бедаў. Яно не вядзе да шчасця. Нам трэба услухацца ў голас Святога Духу, які дапаможа нам стаць сведкамі хрысціянства, бо гэта нашыя карані. А дрэва не будзе зялёным без каранёў. І мы без сваіх каранёў не зможам жыць хрысціянскай верай", – такі быў сэнс прамовы Тадэвуша Кандрусевіча.

Мітрапаліт Кандрусевіч прасіў таксама кардынала Бэртонэ сказаць для моладзі такія пранікнёныя словы, каб моладзь стала надзеяй для касцёла, супольнасці і краіны, "каб наша краіна была знаная не толькі тым, што мы будуем добрыя трактары, добрыя МАЗы, добрыя БелАЗы, але і тым, што мы з'яўляемся хрысціянамі! Што мы абараняем хрысціянскія каштоўнасці і на гэтых хрысціянскіх каштоўнасцях будуем нашу будучыню".

**Артур Лагодны**
**Фота аўтара**

## З паслання Тарчэзыо Бэртонэ да серабранаўцаў

**Вітаю вас з самымі цёплымі пачуццямі. Дзякуй вам за ваш цёплы прыём! Я прывёз прывітанне і бласлаўленне Святога Айца Бенедыкта XVI, якое ён перадае вам і ўсім вашым блізкім. Папа вас любіць і моліцца за вас. Адразу прызнаюся, што тут я адчуваю сябе амаль як дома, нават нягледзячы на тое, што мы цяпер у тысячах кіламетраў ад Рыма. Тады чаму ж мне здаецца, што я дома? Таму што я цяпер сярод юнакоў і дзяўчат у парафіі, якая даручана душпастырскай апецы салезіянаў! Магчыма, вы ведаеце, што я таксама салезіянін, выхаваны ў духоўнай школе Святога Яна Боска — айца і апекуна моладзі.**

**…Я згадваю словы Папы Яна Паўла II, якія вам, як я ведаю, вельмі адпавядаюць. Гэтыя словы ён прамовіў да амаль двух мільёнаў юнакоў і дзяўчат, сабраных у Рыме з нагоды Юбілею 2000 года. "Дарагія сябры, — сказаў Святы Айцец, — таксама і сёння верыць у Хрыста, ісці за Хрыстом па слядах Пятра, Тамаша, першых апосталаў і сведкаў, — гэта азначае заняць цвёрдую пазіцыю ў адносінах да Яго, а часам нават прыняць амаль новае пакутніцтва: пакутніцтва таго, хто сёння, як і ўчора, паклікан ісці супраць плыні, каб наследаваць Боскага Настаўніка" (Прамова падчас вігіліі ў Тор Вэргата). Караль Вайтыла па сваім уласным досведзе цудоўна ведаў, што значаць гэтыя словы: у маладосці ён перажыў вайну і нацызм, а крыху пазней — камуністычны рэжым. Амаль 27 гадоў Ян Павел II вёў моладзь шляхам сапраўднай свабоды, якую дае Евангелле Езуса Хрыста. Ён таксама сцвярджаў, што для таго, каб быць свабодным, недастаткова разбурыць сцены. Неабходна стаць унутрана свабодным! А гэта магчыма толькі пры сустрэчы з Божаю праўдаю, таму што, як кажа Езус, толькі праўда можа даць сапраўдную свабоду (пар. Ян 8, 31–32)...**

ВЫБАРЫ-2008



АРТУР ЛАГОДНЫ

# Чароўная скрыня

**Назіральнікі на ўчастку № 476 Старавіленскай выбарчай акругі № 105 па вул. Азізава, дзе балатаваўся дэмкандыдат Анатоль Лябедзька, шакаваныя разыходжаннем у колькасці галасаваўшых і колькасці бюлетэняў, якія былі дастаныя са скрыні галасавання.**

Паводле падлікаў назіральнікаў, якія пільна адсочвалі закідванне кожным выбарцам бюлетэня ў скрыню для галасавання, у дзень выбараў галасавала 474 чалавекі, аднак, паводле слоў старшыні камісіі, у скрыні асноўнага галасавання сябры камісіі аказалася 574(!) бюлетэня. Такім чынам, невядома адкуль у скрыні з'явілася 100 лішніх бюлетэняў.

Варта таксама адзначыць, што на ўчастку датэрмінова прагаласавала каля 40% ад усіх, хто галасаваў увогуле. Лічыць колькасць галасоў за кожнага кандыдата камісія палічыла вартым толькі пасля таго, як былі змяшаныя бюлетэні са ўсіх скрыняў. Гэткія цуды адбываліся на вачах прадстаўніка Венгерскай амбасады, які меў статус міжнароднага назіральніка ад АБСЕ.

На выбарах па акрузе атрымаў "элегантную" перамогу кандыдат ад улады, старшыня суда Цэнтральнага раёна Мікалай Самасейка. Як паведамляюць праваабаронцы, Самасейка сёлета адміністрацыйна пакараў сем чалавек за тое, што яны прынялі ўдзел у мітынгу пратэсту прадпрымальнікаў.

**А.Л.**

ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

# Мастацтва яднае



АРТУР ЛАГОДНЫ

**На фасаднай сцяне капліцы серабранскай парафіі Яна Хрысціцеля, што на рагу вуліц Пляханава і Гараўца, з'явілася ўнікальная базіліка**

"Базіліка выканана ў старадаўнім візантыйскім стылі, аздобленая грэцкімі надпісамі. Ян Хрысціцель трымае маленькага Ісуса Хрыста. Такі роспіс не характэрны для касцёлаў, якія будаваліся пасля XIV стагодзя, хутчэй гэта ўласціва для праваслаўных цэркваў. Але пробашч касцёла Ігар Лашук блаславіў эскіз. Я лічу, гэта вельмі добра, бо будзе спрыяць яднанню ўсіх хрысціян", – кажа аўтар твора Алесь Пушкін.

АНОНС



**У наступным нумары спецыяліст у галіне энергетыкі, прыхільнік будаўніцтва атамнай станцыі Станіслаў Гусак, тлумачыць, чаму нельга будаваць у Беларусі расійскую АЭС**

ЖАРТ



МАЛЮНАК ЮРАСЯ НАВІЦКАГА

**Адчуй сябе шляхцічам :)**

Мясцовае недзяржаўнае грамадска-палітычнае выданне
**"Вольная Серабранка"**
Выдаецца на беларускай мове сучасным правапісам.
Выдавец і заснавальнік – супольнасць дэмакратычных актывістаў Ленінскага раёна г. Мінска.

Друкуецца пры падтрымцы ЦВІ г. Мінска.
За змест матэрыялаў адказваюць аўтары па меры магчымасцяў.
Галоўны рэдактар – Артур Лагодны.
**Пры выкарыстанні матэрыялаў і фотаздымкаў "ВС" спасылка абавязковая!**

Капіяванне газеты і распаўсюд сярод сваякоў і знаёмых вітаецца.
Рэдакцыйны інтэрнет-адрас: serabranka@tut.by
Рэдакцыйны тэлефон: (+37529)9625143
Інтэрнэт-старонка: http://serabranka.at.tut.by

**РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА БЯСПЛАТНА**
Наклад 299 экз. (дадатковы 1). Замова № 89-.
Падпісана ў друк у 0:55 19.10.2008 г.